

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 14 (206) 6 кастрычніка 1993 года, серада*


## Тэлетайп

### *Пасяджэнне групы інспектараў*

28 верасня адбылося пасяджэнне інспектарскай групы універсітэта, якая разглядзела наступныя пытанні на 1993-94 навучальны год.

1. Абмеркаванне і зацверджанне плана работы інспектарскай групы (верасень 1993 г.).
2. Аб стане працоўнай дысцыпліны ва універсітэце (кастрычнік 1993 г.).
3. Арганізацыя практыкі на польскім аддзяленні факультэта філалогіі народаў РБ (кастрычнік 1993 г.).
4. Выкананне планавання на факультэтах і кафедрах інжынернага факультэта (лістапад 1993 г.).
5. Аб скарыстанні ў вучэбных і навуковых мэтах тэхнічных сродкаў навучання (снежань 1993 г.).
6. Стан выхаваўчай работы ў студэнцкіх інтэрнатах і ў акадэмічных групах (студзень-люты 1994 г.).
7. Аб наборы студэнтаў на платную форму навучання (сакавік 1994 г.).
8. Выкананне рашэнняў Рады універсітэта, загада рэктара па беларусізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ГрДУ.

**М. ВАСІЛЮЧАК,**
**старшыня групы.**

### *Гарадзенскія запісы*

Факультэт беларускай філалогіі і культуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, Гродзенская суполка фонду Культуры выдалі першы выпуск «Гродзенскіх запісаў», якія прысвечаны гісторыі і культуры Гарадзеншчыны.

Зборнік складаецца з трох раздзелаў: «Даследаванні», «Крыніцы», «Памятныя даты».

Чытачы могуць даведацца пра Гродзенскую Каралеўскую медычную акадэмію (А. Мілінкевіч), пра музей прыроды ў Гародні (А. Плешаваня), пра старажытныя евангеллі з Гарадзеншчыны (А. Пяткевіч), пра кніжную калекцыю ў Шчорсах (І. Трусаў). Зацікавіць могуць чытачоў і сляды Кастуся Каліноўскага (С. Дрозд), тапанімія і гідранімія басейна ракі Свіслач (А. Цыхун), лексічная спадчына жыхароў Зэльвеншчыны (П. Сцяцко) і іншыя матэрыялы.

Раздзел «Крыніцы» прадстаўлены даследаваннем пра дзейнасць езуіцкай Гродзенскай калегіі, пратаколам Беларускага сялянскага з´езду ў Гародні, прысудам Гродзенскай абласной пракуратуры, а таксама аўтабіяграфічным нарысам Радлеўскага.

У апошнім раздзеле змешчаны каляндар памятных датаў культуры Гарадзеншчыны на 1993 год.

Гэты першы навуковы зборнік на Гарадзеншчыне выйшаў дзякуючы Гарадзенскаму фонду Культуры, у прыватнасці сп. Сяргею Габрусевічу.

Зборнік «Гарадзенскія запісы» можна набыць па адрасу: г. Гродна, вул. Леніна, 32 (факультэт беларускай філалогіі і культуры), пакой 19.

*Нашы юбіляры*

## Адхіляючы заслону гадоў

***Вялікі рымскі стоік, знаўца таямніц чалавечага жыцця, пісаў: «Ні з кім не адбываецца нічога з таго, вытрымаць што ён не меў бы сіл». Гэтыя словы антычнага мудраца вельмі падыходзяць у якасці эпіграфа да жыццёвага шляху нашай сучасніцы і калегі, выдатнага спецыяліста ў галіне антычнай філасофіі, філалогіі і культуры Браніславы Барысаўны Віц.***

21 верасня яна адзначыла свой юбілей. Гэта нагода не толькі каб шчыра павіншаваць юбіляра і перадаць ёй праз газету пажаданні плённай працы і добрага здароўя. Гэта таксама нагода, каб трохі адхіліць заслону гадоў і далучыцца да вельмі суцэльнага і вельмі складанага лёсу маленькай, на выгляд старамоднай, рухавай, трохі мітуслівай і чымсці заклапочанай кабеты.

Браніслава Барысаўна належыць да тых лепшых прадстаўнікоў гэбрэйскай інтэлігенцыі, якія ўсё сваё жыццё аддалі справе адукацыі, выхавання, навукі і якім наканавана было спазнаць увесь цяжар бед, якія выпалі на долю гэтага народа ў XX стагоддзі.

Б. Б. Віц (Маргулес) нарадзілася ў 1918 годзе ў г. Драгобычы на Заходняй Украіне ў сям´і настаўніка гімназіі. Напэўна, гэта прадвызначыла яе захапленне, і пасля заканчэння Львоўскай гуманітарнай гімназіі яна становіцца студэнткай Львоўскага універсітэта. У гэтай адной са старэйшых і вядомых вышэйшых навучальных установаў у Еўропе з традыцыямі класічнай адукацыі Браніслава Барысаўна вучылася адразу на двух аддзяленнях: філасофіі і класічнай філалогіі. Вядомыя падзеі верасня 1939 г. прывялі да рэарганізацыі універсітэта, і маладая студэнтка была пераведзена на гістарычны факультэт. Але скончыць яго не дазволіла вайна. Калі яна пачалася, засталіся толькі дзяржаўныя іспыты. Але не скончаны універсітэт — гэта толькі пачатак таго ланцуга страшных страт, якія давялося зведаць разам з мільёнамі маладой дзяўчынцы. На фронце загінуў муж. У акупіраваным Львове фашысты аднялі жыццё самым блізкім — маці, сястры. Сама Б. Б. Віц з пачатку вайны эвакуіравалася ў Краснадарскі край, пасля ў Ташкент, дзе атрымала дыплом аб вышэйшай адукацыі, здаўшы дзяржаўныя іспыты ў Сярэднеазіяцкім універсітэце. За плячыма — грунтоўная падрыхтоўка ў галіне антычнай гісторыі і філалогіі. У душы — замілаванне да старажытнай Элады і яе культуры. Наперадзе — вялікае жыццё, новыя гарады, новыя сустрэчы, новыя выпрабаванні і шмат самаадданай працы.



У Сярэднеазіяцкім універсітэце на Б. Б. Віц звярнуў увагу буйны спецыяліст у галіне старажытнай гісторыі В. В. Струве, да якога яна паступіла ў аспірантуру. Пасля заканчэння вайны яе супрацоўніцтва доўжылася ў Ленінградзе. Вучылася Б. Б. Віц паспяхова, здала 11 (не тое, што сёння!) кандыдацкіх іспытаў, з іх 8 па антыказнаўству. Хвароба не дазволіла своечасова абараніць дысертацыю. Пасля аспірантуры праца ў Бібліятэцы АН СССР. У той жа час распачалося яе супрацоўніцтва з іншым буйным вучоным прафесарам С. Я. Лур´е, разам з якім яна працавала над падрыхтоўкай будучага выдання перакладаў урыўкаў і фрагментаў з твораў Дэмакрыта. Менавіта ў той час з´явіўся інтарэс да гэтай буйнейшай постаці сусветнай філасофскай думкі, які пазней выльецца ў вядомую кнігу.

Навуковыя кіраўнікі ставіліся да Браніславы Барысаўны з павагай, цанілі яе здольнасці´, імкнуліся дапамагчы ёй у складаныя моманты жыцця. У адозве, якую даў ёй С. Я. Лур´е, чытаем: «добра валодае новымі і дзвюма старажытнымі мовамі, мае вялікія здольнасці даследчыка, набыла сур´ёзную эрудыцыю ў галіне дасакратаўскай грэчаскай філасофіі». Блізкую думку выказваў В. В. Струве: «Лічу сваім абавязкам заявіць, што ў асобе Б. Б. Віц мы маем маладога таленавітага даследчыка з вялікімі ведамі ў галіне гісторыі і культуры антычнасці і добрым знаёмствам з антычнымі мовамі і мовамі заходнееўрапейскімі».

Абедзве характарыстыкі дадзены ў 1947 годзе. З тых часоў і да сёняшняга дня Браніслава Барысаўна захавала вялікую павагу і ўдзячнасць да сваіх настаўнікаў.

Крыху пазней лёс закінуў яе ў Карэлію, дзе яна працавала настаўніцай у вясковай школе. Але нягледзячы на штучна створаныя ўмовы, Б. Б. Віц працягвала займацца навуковай працай і ў 1953 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю «Грамадска-палітычныя погляды Пратагора». Атрымаўшы ступень кандыдата гістарычных навук, яна пераязджае ў Вільню, дзе працуе ў шэрагу навучальных установаў (у Віленскім настаўніцкім інстытуце з польскай мовай выкладання, у педінстытуце і педвучылішчы). У 1965 годзе пераязджае ў Гродна. На працягу 23 год яна працавала ў сельскагаспадарчым інстытуце. За гэты час яна, выкладчыца філасофіі, падрыхтавала другую кандыдацкую дысертацыю па філасофіі, але яна засталася неабароненай. З 1988 года Браніслава Барысаўна працуе на гістарычным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Яна выкладала гісторыю старажытнага Усходу, чытала спецкурс па гісторыі антычнай культуры, вядзе навукова-даследчую работу са студэнтамі. Шмат энергіі аддала Б. Б. Віц дапамозе Музею гісторыі рэлігіі, асабліва ў крытычныя перыяды яго існавання.

Філасофская грамадскасць ведае Браніславу Барысаўну як аўтара вядомых перакладаў на расейскую мову тэкстаў і фрагментаў Дэмакрыта, а таксама як аўтара кнігі пра славутага грэчаскага філосафа, якая ўбачыла свет у 1979 г. і была двойчы перакладзена на замежныя мовы. Гэтая кніга — арыгінальнае манаграфічнае даследаванне пра жыццё і творчасць вялікага філосафа-матэрыяліста. Дасканалае веданне мовы і крыніц дазволіла зрабіць цікавую працу, па-новаму паглядзець на постаць Дэмакрыта, яго месца ў гісторыі філасофіі і культуры. І да сёняшняга дня Б. Б. Віц самаадданa працуе нягледзячы на ўзрост, стан здароўя, а часам і матэрыяльныя цяжкасці. З´яўляючыся членам Усерасійскай (былой Усесаюзнай) асацыяцыі антыказнаўцаў, удзельнічае ў штогодных канферэнцыях, друкуецца ў зборніках, працуе ў архівах. Браніслава Барысаўна паліглот, ведае дзесяць старажытных і сучасных моваў.

Віншуючы Браніславу Барысаўну з 75-годдзем, хочацца пажадаць ёй здароўя, сілы духу, шмат яшчэ плённых гадоў працы і здзяйснення ўсяго задуманага.

**М. БЕСПАМЯТНЫХ,**
**кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры сусветнай культуры.**



## Анонс



*Матэрыялы аб фальклорнай практыцы студэнтаў-першакурснікаў філалагічнага факультэта, якіх вы бачыце на гэтых здымках, чытайце на 4-й старонцы газеты.*

*Гэты навучальны год філфак пачаў без Міхаіла Аляксандравіча Корчыца, прафесара кафедры рускай мовы.*

*Так сталася, што пахаванне нашага любімага настаўніка і калегі было гэткім жа сціплым, як і яго жыццё: студэнты і выкладчыкі былі ў адпачынку.*

*Няхай жа ўспаміны тых, хто вучыўся ў Міхаіла Аляксандравіча і знаўся з ім, лягуць жалобным вянком да светлай памяці гэтага цудоўнага чалавека.*

**М. І. КАНЮШКЕВІЧ,**
**заг. кафедры рускай мовы.**

# Міхаілу Аляксандравічу Корчыцу — вучонаму, настаўніку, чалавеку



## У бясконцай дарозе

Міхаіл Аляксандравіч... Сэрца і розум ніяк не могуць змірыцца, ніяк не могуць зразумець і паверыць, што яго больш няма з намі. Крыўдна і балюча. І разам са слязамі наплываюць успаміны, светлыя і цёплыя...

Я, яшчэ толькі студэнтка філфака, працую лабаранткай на кафедры рускай мовы. І вось строгі экзаменатар, з выгляду суровы і пахмурны чалавек, Міхаіл Аляксандравіч заводзіць гульню, цікавую і карысную. У Міхаіла Аляксандравіча было шмат матэрыяла, цікавых прыкладаў на розныя віды сказаў. Усё гэта было старанна выпісана на карткі, так што атрымлівалася своеасаблівае лато. Кожную вольную хвіліну ён прыходзіў да мяне са сваімі карткамі: «А ну скажы, што гэта за сказ?». І тут пачыналася гульня. Я не скажу, што не хвалявалася пры ягоных пытаннях, але не баялася гэтых пытанняў ніколі, не баялася памыліцца. Не баялася, бо побач быў не настаўнік, а просты, добры чалавек, з вачыма, у якіх мітусіліся заўзятыя дзіцячыя чорцікі.

Успамінаецца і паездка разам з Міхаілам Аляксандравічам у Дзятлава, дзе мы з ім праводзілі раённую алімпіяду школьнікаў па рускай мове; той незабыўны марозны вечар, калі мы вярталіся ў гасцініцу пасля цяжкага працоўнага дня. Міхаіл Аляксандравіч расказваў вясёлыя гісторыі, разам смяяліся. І я зусім не адчувала, што паміж намі вялікая дыстанцыя: ён — дацэнт, кандыдат навук, сталы чалавек, я — студэнтка-пяцікурсніца, зусім яшчэ дзяўчо. Ён адносіўся да мяне, як заклапочаны бацька адносіцца да свайго стамленага за дзень дзіцяці.

Успамінаюцца і дзівацтвы Міхаіла Аляксандравіча. Аднойчы ягоны вялікі і шмат пабачыўшы партфель сапсаваўся — адарвалася ручка. Наступнага дня Міхаіл Аляксандравіч прыйшоў ва універсітэт з... чамаданам. «Куды вы едзеце?» «Нікуды. На працу прыйшоў» «З чамаданам?..»

Ён так і хадзіў з чамаданам, нягледзячы на тое, што з ягоных дзівацтваў падсмейваліся. А мы не разумелі, што наш Міхаіл Аляксандравіч быў штодня ў дарозе, у падарожжы за новым, цікавым, карысным людзям, дзе заўсёды трэба мець з сабою чамадан, чамадан ведаў, дабрыні і сумлення.

Ён пайшоў... Пакінуўшы нас на гэтай дарозе, пакінуўшы нам свой чамадан, чамадан бясконцага адчаю, цёплых успамінаў, вялікіх спраў і светлай памяці.

**С. Я. КОСТРЫЦА,**
**ст. выкладчык кафедры рускай мовы.**

## Дзякуй Вам!

Няма больш Міхаіла Аляксандравіча Корчыца. Пайшоў ад нас цудоўны Чалавек, таленавіты вучоны. Ён жыў сціпла і сціпла памёр. Мала хто ведаў, што невылечная хвароба абрала яго сваёй ахвярай — ён да апошняга імгнення працаваў, упарадкоўваў велізарны навуковы, метадычны і дыдактычны матэрыял, шліфаваў і без таго дасканалыя камп´ютарныя праграмы. Ведаў, што хутка яго не стане, і таму спяшаўся зрабіць як мага больш.

Мне не давялося быць студэнткай Міхаіла Аляксандравіча, але ўсё ж пашчасціла вучыцца ў яго — вучыцца чалавечай годнасці, прынцыповасці, непадкупнасці, бескампраміснасці з уласным сумленнем, уменню слухаць і разумець другога чалавека, аддаваць усяго сябе справе. Дзякуй Вам, Міхаіл Аляксандравіч, за тое, што Вы былі, што шчодра ахвяроўвалі сябе нам, дзяліліся не толькі ведамі, але і душою, сэрцам. Вы для нас заўсёды жывы і не толькі таму, што мы ніколі не забудзем пра Вас, але і таму, што ніхто не зможа нам Вас замяніць.

**Л. В. РЫЧКОВА,**
**дэкан факультэта філалогіі народаў РБ.**

## Горка і балюча

Усяго чатыры гады прайшло, як наш курс скончыў універсітэт, а няма ўжо сярод маіх настаўнікаў трох выкладчыкаў, трох добрых, мілых людзей.

Няма і Міхаіла Аляксандравіча Корчыца... Самае горкае і балючае — гэта казаць словы ўдзячнасці, калі той, каму яны адрасаваны, ужо ніколі іх не пачуе. Можа, і сапраўды павінен прайсці нейкі пэўны час, перш чым усвядоміш, як жа многа даў нам Міхаіл Аляксандравіч.

Мы ўпарціліся, лічылі, што ён занадта строгі і прыдзірлівы, баяліся прапусціць лекцыю не таму, што гэта незаменная страта, а таму, што будуць правяраць прысутнасць. Усё гэта забылася цяпер. Але як забыць усмешку Міхаіла Аляксандравіча, калі ён, перапраўляючы спіс прысутных, знаходзіў там прозвішчы Віцын, Нікулін, Маргуноў (мы іх упісвалі замест тых, каго не было на занятках). Зачытваў і смяяўся разам з намі і над сабой, што папаўся на нашыя хітрыкі. І як не было той строгасці — проста добры і вясёлы чалавек адгукаўся на не вельмі ўжо і такі дасціпны студэнцкі жарт.

А строгасць яго саслужыла нам вельмі добрую службу: схемы і правілы, што вучылі пад яго пільным вокам, запомнілі назаўсёды. Мы ўдзячны настаўніку за веды, за цудоўныя, добрыя і смешныя апавяданні, што чытаў ён нам на студэнцкіх вечарынах, за патрабавальнасць, за дабрыню і чалавечнасць...

Калі нішто не знікае бясследна, то няхай наша ўдзячнасць будзе Вамі, Міхаіл Аляксандравіч, прынята, пачута там, дзе цяпер Ваша чулая душа.

**Алена СМІРНОВА,**
**выпускніца філфака 1989 года.**

## Не выказаць прызнання ўдзячнасці

Незваротнасць кожнага імгнення ад сустрэч з Настаўнікам, што пайшоў ад нас назаўсёды, усведамляецца цяпер як горкая незаменнасць тых гармонаў інтэлекту, якія Міхаіл Аляксандравіч так шчодра дарыў, а мы ахвотна бралі, не вельмі задумваючыся пра іх каштоўнасць. Тады не задумваючыся, а цяпер пакутуючы ад невыказанага прызнання ўдзячнасці...

Сказаць пра тое, што ён быў Настаўнікам,— гэта адзначыць толькі адну яркую грань яго асобы. Сказаць, што ён быў Настаўнік Настаўнікаў—гэта прызнаць бясспрэчнасць і бязмернасць яго прафесійнага ўкладу ў развіццё адукацыі на Гродзеншчыне, у выхаванне кагорты настаўнікаў-славеснікаў.

Сказаць, што і ты сама калісьці мела шчасце вучыцца ў гэтага кранальна сціплага, усёведаючага і карэктна адказнага чалавека — гэта нясмела прызнацца ў дакрананні да энергадонара, да носьбіта высокіх часціц Ведаў і інтэлігента разумных Узаемін. З гэтым, я ведаю, згодзяцца ўсе яго былыя выпускнікі, што цяпер настаўнічаюць на Гродзеншчыне.

А як не сказаць і не ўспомніць кранаючую адказнасць і прадбачлівы клопат пра будучых філолагаў, з якімі Міхаіл Аляксандравіч выконваў, акрамя сваіх штатных, абавязкі члена і старшыні журы абласных і рэспубліканскіх алімпіяд!

Ён быў з намі. Быў неабходны, не стараючыся быць прыкметным. Яго ведалі. З ім раіліся. Яго чакалі. Яго любілі.

Вось увойдзе ціхенька, нягучна штосьці скажа, і ўсё адразу стане на сваё месца, знойдзецца рашэнне, адказ...

Калі ён стаяў за кафедрай ці сядзеў за сталом у аўдыторыі, мала хто ведаў ці разумеў боль яго страшнай хваробы. Немагчыма было асмеліцца ўголас здзівіцца яго мужнасці Жыць, яго волі, што дапамагала быць у страі. А ён карпатліва, метадычна і мужна нёс свой крыж? Не, свой факел Святла і Любові.

Не вымаліць прыжыццёвага спаткання з Міхаілам Аляксандравічам. Але і не згаснуць агню яго Справы, што стала Жыццём.

І калі праўда, што на саракавы дзень пакіне Зямлю душа гэтага незабыўнага чалавека, то няхай яе вечны палёт падтрымаюць крылы нашай светлай Памяці.

**А. ГАРАЧАВА,**
**вядучы інспектар упраўлення народнай адукацыі аблвыканкама ,выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь.**

## Памятаю...

У маёй памяці два Міхаілы Аляксандравічы. Першы — строгі, суровы, патрабавальны, дакладны ў словах і выказваннях. Сам яго курс, сінтаксіс, патрабаваў быць лагічным і паслядоўным. Учынкі і выказванні складваліся ў сістэму. Сістэму працы, сістэму жыцця.

У Міхаіла Аляксандравіча не было любімчыкаў: зарабіў — трымай сваю «пяцёрку», не працаваў — хоць за цябе міністр будзе прасіць, «здавальняюча» не ўбачыш.

Але мы яго бачылі і другога. Мяккага, добрага ´, чалавечнага. Нават двойку ён, не ў прыклад іншым сваім калегам, ставіў не прыніжаючы годнасць студэнта, паважаючы ў ім асобу. Будучы намеснікам дэкана, ведаў нашы праблемы, умеў неяк непрыкметна для нас падтрымаць, дапамагчы. Памятаю, як адна з маіх аднакурсніц, упэўненая, што яе за пропускі адлічаць, вярнулася з дэканата ашаломленая: «Корчыц заступіўся!». А ён проста даведаўся пра цяжкую сітуацыю ў яе сям´і.

І яшчэ я памятаю яго ўсмешку. Усміхаўся ён рэдка, часцей смяяліся вочы... Памятаю, як падчас Дзён філфака нашы выкладчыкі спаборнічалі ў мінілекцыях (не больш пяці хвілін). Міхаіл Аляксандравіч выйшаў на сцэну і прачытаў лекцыю на тэму «Чорны кот як прычына спазнення на лекцыю». Зала ляжала покатам ад рогату, а лектар — хоць бы што: сур´ёзны, засяроджаны, лагічны, як быццам справа ішла пра складаназалежны сказ.

Каюся: некалькі разоў выходзіў я на сцэну з пародыяй на Корчыца. Калі гэта было ўпершыню, я, скончыўшы нумар, з апаскай паглядзеў у залу — і не паверыў вачам! Міхаіл Аляксандравіч рагатаў да слёз! А назаўтра, сустрэўшы мяне ў калідоры, сур´ёзна сказаў: «Бачыў. Хаду маю асвоіў, а голас пакідае жадаць лепшага. А што, рэктара таксама зможаце так?» Атрымаўшы адмоўны адказ, задаволена заўважыў: «Значыць, я асоба ярчэйшая. Яшчэ дзве-тры такія пародыі, і можна балаціравацца на пасаду рэктара». А ў вачах смяшынкі іскрацца. Пацісну руку і пайшоў на лекцыю.

А цяпер пайшоў назаўсёды. І жыццё стала беднейшае. Так бывае заўсёды, калі з яго адыходзіць чысты і цудоўны чалавек.

**Аляксандр ФЯДУТА,**
**першы сакратар ЦК Саюза моладзі Беларусі, выпускнік філфака 1986 г.**

## НО С КАЖДОЙ СМЕРТЬЮ, С КАЖДЫМ ДНЁМ НАМ ЖИЗНЬ СТАНОВИТСЯ ЗАМЕТНЕЙ...

Пайшоў Міхаіл Аляксандравіч Корчыц... І ўспомнілася: а ён жа сустракаў нас, абітурыентаў, калі быў старшынёй прадметнай камісіі па рускай мове і літаратуры! І было гэта 19 гадоў назад.

Засяроджаны, сур´ёзны чалавек збіраў нашы сачыненні, нечакана з´яўляўся ў аўдыторыі падчас вуснага экзамену, калінікалі задаваў хітрыя пытанні. Учарашнія школьнікі палохаліся і, нават стаўшы студэнтамі, доўга не маглі пераадолець гэтую баязлівасць перад Міхаілам Аляксандравічам. Пасля прыйшло разуменне і яснасць: дацэнт Корчыц — з тых, хто возьмецца за цябе ўсур´ёз і зробіць цябе спецыялістам. Не ўмееш — навучыць, разгубіўся — дапаможа, лянуешся — запатрабуе. Спакойна і дзелавіта.

Вучні раслі, самі рабіліся настаўнікамі, а то і калегамі Міхаіла Аляксандравіча па кафедры. «Прафесіянал, майстар»,— гэта скажа пра яго кожны выпускнік. А што мы яшчэ пра яго ведалі? Ды амаль нічога: Міхаіл Аляксандравіч умеў захоўваць дыстанцыю. Неяк успрыймалася, што Корчыц на філфаку — гэта надоўга, гэта надзейна.

А вось пайшоў нечакана і даў сваім вучням апошні ўрок, што пара задумацца.

Но с каждой смертью, с каждым днем
Нам жизнь становится заметней,
И все сильней в любви нужда...
Поменьше зимних дней,
побольше было б летних!
Когда бы было так, как никогда...

**Выпускнікі 1978 г.**

## «Жить не по лжи»

Міхаіл Аляксандравіч Корчыц адыходзіў ад жыцця гэтаксама, як і ішоў па ім. Можа толькі самыя блізкія яму людзі, ды і то калі пакуты сталі зусім невыносьнымі, чулі ад яго нешта блізкае да скаргі. Нават калі б гэта было адзіным успамінам пра Міхаіла Аляксандравіча, і то памяць аб ім стала б урокам для многіх з нас.

Наколькі я ведаў яго, Міхаіл Аляксандравіч умеў вучыць, ніколі не павучаючы. Вучыў перш за ўсё тым, як ён ставіўся сам да справы, няхай гэта заняткі са студэнтамі ці ўласная даследніцкая праца. Яго патрабавальнасць у першую чаргу да сябе давала яму права быць патрабавальным і да іншых. Але гэтая патрабавальнасць не пераходзіла ні ў жорсткую нецярпімасць, ні ў нудотную павучальнасць. Не адно пакаленне сёняшніх настаўнікаў-славеснікаў сваёй прафесійнай культурай удзячна ўрокам Карчыца-лінгвіста.

Апошнім часам стала папулярнай фразай формула А. І. Салжаніцына «жить не по лжи». Яе часта са слязой на вачах любяць паўтараць людзі, што супярэчаць ёй ледзь не на кожным кроку. Міхаіл Аляксандравіч ніколі не чытаў пропаведзяў на гэты конт, дарэчы як наогул не любіў гаварыць пропаведзяў. Ён проста быў чэсны і праўдзівы. Заўсёды і ва ўсім, незалежна ад асобы і акалічнасцяў. Такія паводзіны былі доўгім і недакучлівым урокам выхаванасці і для студэнтаў, і для нас, яго калег.

Амаль паўтара стагоддзя назад адзін рускі паэт адгукнуўся на смерць знакамітага крытыка радкамі: «Не говори с тоской: их нет! Но с благодарностию: были!» Цяпер іншы час, ды і маштаб адыйшоўшага ад нас калегі і настаўніка таксама іншы. І ўсё ж, калі думаеш пра Міхаіла Аляксандравіча, хочацца паўтарыць гэтыя радкі.

**І. ЯГОРАЎ,**
**дацэнт кафедры рускай і замежнай літаратуры.**

# Аперацыя «Бульба»

## Вёсцы — актыўную дапамогу

***Кожную восень студэнты Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта аказваюць адчувальную дапамогу сельскім працаўнікам на ўборцы ўраджаю. Асабліва неабходна яна сёлета. Гэта звязана з неўстойлівым надвор ´ем.***

І таму ў адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб неадкладных мерах у сельскай гаспадарцы ў сувязі са складанымі пагоднымі ўмовамі» ад 25 чэрвеня 1993 года № 418 і рашэння выканкама Гродзенскага абласнога савета народных дэпутатаў ад 19.08.93 г. ва універсітэце была створана аператыўная група на перыяд правядзення сельскагаспадарчых работ на добраахвотнай аснове з 6 верасня на срок не звыш аднаго месяца. Задача студэнтаў у тым, каб убраць ураджай пры мінімальных стратах.

Згодна загаду рэктара універсітэта «Аб мерах па арганізацыі сельскагаспадарчых работ» былі падрыхтаваны і зацверджаны спісы атрадаў, іх камандзіраў, кіраўнікоў-выкладчыкаў. Былі праведзены нарады, інструктаж па ТБ са студэнтамі, выязджаючымі на сельскагаспадарчыя работы. Своечасова былі распрацаваны дагаворы і ўмовы аплаты працы студэнтаў і выкладчыкаў.

Месцамі дыслакацыі для сельгасатрадаў нашага універсітэта сёлета сталі многія раёны вобласці — Дзятлаўскі (182 чалавека), Іўеўскі (55), Астравецкі (98), Ашмянскі (125), Слонімскі (128), Смаргонскі (124), Свіслацкі (35), Шчучынскі (60), Карэліцкі (105), Гродзенскі (52 чалавека). Да пачатку работ з імі заключаны адпаведныя дагаворы, у якіх абумоўлены ўмовы працы, яе аплаты, быту, забеспячэння харчаваннем.

Арганізацыйная работа па падрыхтоўцы і адпраўленню студэнтаў на сельгасработы адбылася.

**— Ці ўсё прайшло добра? —** з такім пытаннем я звярнулася да У. А. Хілюты, намесніка старшыні аператыўнай групы па правядзенню сельскагаспадарчых работ.

— Заяўкі гаспадарак універсітэт выканаў. На дапамогу вёсцы паехалі 969 студэнтаў, разам з імі — 32 кіраўніка атрадаў.

Але хочацца зазначыць, што пралікі дапусцілі асобныя кіраўнікі гаспадарак, таму прыходзілася ўносіць карэктывы ў планы амаль у апошнія гадзіны, 6 верасня, калі студэнты былі ўжо гатовы да ад ´езду на працу. Так, практычна адмовіліся ад студэнцкай дапамогі Астравецкі (па дагавору — 500, а запатрабавалі толькі 98 чалавек), Ашмянскі (250—125), Іўеўскі (250—55) раёны. Таму мы сфарміравалі дадатковы атрад — у Карэліцкі раён. Калгас «1 Мая» Астравецкага раёна па пагадненню павінен быў прыняць атрад у колькасці 80 чалавек, а ў апошнюю хвіліну запатрабаваў толькі 28.

І вось студэнты — на калгасных палях. Яны павінны працаваць добрасумленна і старанна. Але гэта ў тым выпадку, калі ім для гэтага створана ўсё неабходнае: нармальныя жыллёва-бытавыя ўмовы, ёсць забяспечанасць «фронтам работ», без прастояў і г. д.

**— А ці ўсюды для плённай працы студэнтаў, іх быту, паўнацэннага харчавання створаны належныя ўмовы?**

— Напрыклад, у калгасе «1 Мая» Слонімскага раёна,— гаворыць У. А. Хілюта,— філолагі 3 курса былі размешчаны ў піянерскім лагеры, які не ацяпляўся, не было дзе высушыць мокрую вопратку. І як вынік — трэцяя частка студэнтаў захварэла і не магла выходзіць на работу. Такая ж сітуацыя склалася і ў калгасе «Сасноўка» (таксама Слонімскага раёна) — студэнтаў размясцілі ў школе-інтэрнаце.

Некаторыя гаспадаркі адмовіліся напалову аплочваць харчаванне студэнтаў. І разам з гэтым патрэбна было выконваць высокія нормы выпрацоўкі — 714 кг ад кожнага студэнта. Гэта неарганізаванасць быту, а разам з тым, не вельмі паважлівыя адносіны да студэнтаў, канешне, не ствараюць у іх добрага настрою і не наладжваюць на нармальны працоўны лад.



І апошняе пажаданне на наступны год па правядзенню сельскагаспадарчых работ: у якасці кіраўнікоў атрадаў трэба пасылаць менавіта выкладчыкаў, а не лабарантаў кафедр, і, пажадана, абіраць іх з ліку мужчын.

Асенні працоўны семестр паказвае: настаў час мяняць многае ў адносінах да студэнта як памочніка на асеннім полі. Яму неабходны дакладныя гарантыі, матэрыяльныя стымулы, нармальныя чалавечыя ўмовы і ў быце, і на працы. Элементарныя арганізацыйныя пытанні не павінны станавіцца сур ´ёзнай перашкодай для плённай працы моладзі.

**Н. БЕДЗЬ.**

## На калгасных дзялянках

***Той не сапраўдны студэнт, хто не выпрабаваў сябе ў будатрадзе і не атрымаў восеньскае «хрышчэнне» бульбай. Так лічаць юнакі і дзяўчаты, якія ўжо зведалі сябе ў гэтай справе. І вось зноў верасень, і зноў многія і многія юнакі і дзяўчаты адправіліся ў калгасы.***

Сёлетні верасень нешта скупы на сонечныя цёплыя дзянькі... Яшчэ ў першай яго палове на



двары было холадна, як у канцы кастрычніка, і калі, як не ўвосень, у час уборкі бульбы, усё вырашае надвор ´е?

Для студэнтаў І курса факультэта беларускай філалогіі і культуры, што працавалі ў Гродзенскім раёне ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Прагрэс», холад не перашкода. «Не было б толькі дажджу, і мы хутка пазбіраем бульбу на адведзеным участку»,— казалі дзяўчаты ў першыя дні работы.

Дзяўчынкам трэба было збіраць за 9 гадзін работы прыкладна па 120 кошыкаў дя выканання нормы. А норма даволі высокая — 800 кг ад чалавека. Але не страшныя гэтыя кілаграмы для старанных, добрасумленна працуючых дзяўчат. І тым больш што бульба ўрадзіла нядрэнная.

— Працаваць можна, скорасць хутка з ´явілася,— гавораць студэнткі Таццяна Касцюк, Жанна Крывапос, Ганна Пранько,— хутка запаўняючы кошыкі бульбай. Было б добрае надвор ´е, мы б яшчэ хутчэй усё рабілі. І прыемна рабіць добрую справу, ведаючы, што бульба, якую мы збіралі, ідзе ў Расію, у Грузію, а некаторая частка — адразу ў гандлёвыя кропкі раёна і вобласці.

Як бачыце, настрой у дзяўчат з першых дзён быў бадзёры і баявы. Іх работай задаволены і выкладчыкі — І. У. Груль і В. М. Ламака, што працавалі на полі, і праўленне калгаса. Вось што мне давялося пачуць ад аграномa ўчастка — Уладзіміра Мікалаевіча Сарокі:

— У нас асноўная задача — убраць бульбу як можна хутчэй і без стратаў. Дзяўчатам можна за іх працу паставіць адзнаку «выдатна». Першы год у нас працаваў атрад з Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, і, трэба сказаць, што першае ўражанне нядрэннае. Поле атраду было выдзелена добрае, без камянёў, з мяккай глебай. Пасля дзяўчат не заставалася бульбы ў баразнах, не трэба было іх прымушаць працаваць. Ніхто з поля раней не адыходзіў, заставаліся да канца працы, пакуль не прыйдзе аўтобус, бо ўсе добра разумелі: чым хутчэй выканаеш норму, тым раней паедзеш дадому.

А я, між іншым, зазначу, што гаспадарка стварыла для добрай працы студэнтаў усё неабходнае: загадзя дамовіліся наконт аплаты працы студэнтаў, кожны дзень аўтобус прывозіў дзяўчат на поле з Гродна і пасля работы — у горад. Гарачыя абеды падвозіліся непасрэдна на поле (смачныя, каларыйныя, усім даспадобы). Прапанавалі і вячэру, але дзяўчатам так хацелася хутчэй дадому, у сухое адзенне і цёплае памяшканне! Прастояў практычна не было з-за адсутнасці ці недахопу транспарта. І разам з атрадам — абавязкова аграном.

Вельмі прыемна, што паміж кіраўніцтвам гаспадаркі і атрадам з першых дзён склаліся цёплыя, паважлівыя адносіны.

За месяц працы дзяўчаты асвоіліся, пасябравалі, пазналі, хто чаго каштуе, хто любіць пагультайнічаць, а хто працуе сумленна, з поўнай аддачай. Для першакурснікаў гэта вельмі важна, бо разам ім вучыцца пяць гадоў. Вылучыліся і лідэры — першыя ў працы: Алена Булах, Аксана Грэкава, Святлана Пазняк, Марына Курышка. І ўсе спяшаліся сказаць пра гумарыстак, самадзейных спявачак — Наталлю Жуўтоўскую і Таццяну Каўшовік — увесь час, ці дождж, ці сонейка, яны спявалі песні (беларускія народныя, польскія). Н. Жуўтоўская прыехала вывучаць беларускую мову па накіраванню Міністэрства адукацыі Рэспублікі Польшча. Яе першыя ўражанні:

— Я задаволена, што буду вучыцца і жыць у Гродна. Мне падабаецца атмасфера сяброўства паміж намі. Гэта вельмі добра, што мы на бульбе і не ведалі, хто з нас у якой групе будзе вучыцца.

За першыя працоўныя экзамены студэнткі І курса факультэта беларускай філалогіі і культуры атрымалі добрыя адзнакі. Застаецца пажадаць ім выдатных вынікаў у вучобе.

**Н. ДУДКО.**

## Як раз для вас

# Стыпендыі ад ДААД

***Прапануем увазе чытачоў інфармацыю аб стыпендыях, якія выдзяляе Нямецкая служба акадэмічных абменаў (ДААД) на 1994 г. і 1994/95 навучальны год для Рэспублікі Беларусь.***

Нямецкая служба акадэмічных абменаў (ДААД) — гэта арганізацыя ўсіх універсітэтаў і ВНУ Федэратыўнай Рэспублікі Германія. Яе задача заключаецца ў арганізацыі падтрымкі па развіццю міжвузаўскіх зарубежных кантактаў, асабліва гэта праяўляецца ў абмене студэнтамі і вучонымі, у накіраванні прафесарска-выкладчыцкага саставу для чытання лекцый у іншых краінах.

ДААД распрацаваў праграмы для замежнікаў: выдзяляе стыпендыі кваліфікаваным замежным студэнтам ці выпускнікам ВНУ (як правіла, узрост — не больш 32 гадоў) — для вучобы ці павышэння кваліфікацыі ў нямецкіх ВНУ ці навукова-даследчых інстытутах. ДААД выдзяляе розныя стыпендыі ў залежнасці ад узроўня падрыхтоўкі спачатку на адзін год, стыпендыі могуць быць працягнуты згодна вучэбным мэтам. Таксама ДААД выдзяляе стыпендыі для таго, каб, напрыклад, адшукаць матэрыял для абароны дысертацыі ці для ўдзелу ў летніх вузаўскіх курсах ці на курсах нямецкай мовы ў інстытуце ім. Гётэ ў Германіі.

ДААД дае магчымасць запрасіць замежных вучоных для стажыроўкі ці выкладчыцкай працы тэрмінам да 3-х месяцаў. Стажыроўка павінна адказваць навуковым інтарэсам госця і садзейнічаць яго кантактам з нямецкімі калегамі ў адпаведнай вобласці.

ДААД садзейнічае арганізацыі і правядзенню вучэбна-азнаямленчых паездак замежных студэнцкіх груп і вучоных у Германію з мэтай атрымання агульных краязнаўчых ведаў аб краіне і па спецыяльнасці.

ДААД для падтрымання сувязяў са сваімі былымі замежнымі стыпендыятамі паўторна запрашае іх для кароткатэрміновага прабывання. Па заяўцы ДААД можа дазволіць карыстанне спецыяльнай літаратурай і навуковымі прыборамі. Былыя стыпендыяты з ´яўляюцца адначасова партнёрамі і дарадчыкамі ў развіцці і ажыццяўленні яе праграм.

Для прадстаўлення стыпендыі могуць накіраваць заяўкі:

— вучоныя са ступенямі і званнямі звыш 32-летняга ўзроста для 3-месячнага знаходжання на навуковай стажыроўцы;

— аспіранты, маладыя вучоныя да 32-летняга ўзросту для 10-месячнага навучання на навуковай стажыроўцы;

— студэнты-германісты 3-га курса для навучаня на працягу 1 семестра;

— маладыя вучоныя, аспіранты і студэнты, якія вывучаюць германістыку, а таксама выкладчыкі нямецкай мовы ў ВНУ да 32-летняга ўзросту для навучання на летніх вузаўскіх курсах на працягу 3—4 тыдняў. Ва ўсіх павінна быць вельмі добрае веданне нямецкай мовы, якое пацвярджаецца экзаменам. Пры адборы прымаецца да ўвагі паспяховасць, вынікі экзаменаў, навуковыя веды. Саіскальнікі накіроўваюць заяўкі праз кіраўніцтва ВНУ ў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, дзе здзяйсняецца папярэдні адбор саіскальнікаў. Тэрмін накіравання заявак — восень бягучага года. Канчатковы адбор адбудзецца ў Цэнтральным бюро ДААД у г. Боне.

Фармуляры заяў можна атрымаць у рэктараце ВНУ ці ў Прадстаўніцтве ДААД у Маскве.

Дакументы павінны быць прадстаўлены да 1 лістапада 1993 г.

За больш падрабязнай інфармацыяй наконт атрымання стыпендый, якія выдзяляе Нямецкая служба акадэмічных абменаў, можна звяртацца ў аддзел маркетынгу, інфармацыі, рэкламы і замежных сувязяў (аўд. 302 у гал. корпусе універсітэта).

## Спадчына

*Не шукай ты шчасця, долі*
*На чужым, далёкім полі...*
*Ты ўсё знойдзеш гэта блізка,*
*Там, дзе маці над калыскай*
*Табе песні напявала,*
*Як малога калыхала.*

**Я. Купала «Не шукай...»**

# «З народных глыбінь»

З маленства ў наша жыццё ўваходзіць народная паэзія. У дзяцінстве нас прываблівае мілагучная калыханка матулі. Пазней мы захапляемся дзівоснай казкай бабулі або дзядулі. Здзіўляемся мудрасці, паэтычнай прыгажосці прыказак і прымавак. На народнай паэзіі вучымся дабру і справядлівасці, самаадданай любові да роднай краіны і свайго народа.

Час бяжыць, але цікавасць не змяншаецца да народных твораў, якія служаць магутным сродкам вобразнага пазнання. Вось і едуць маладыя людзі ў глыбінку, каб далучыцца да духоўнага багацця свайго народа, каб па крупіцах сабраць нашу культурную спадчыну.

З 1 па 14 ліпеня група студэнтаў-першакурснікаў філалагічнага факультэта праходзіла фальклорную практыку на Ашмяншчыне.

Першыя маршруты пралеглі ў вёскі Кракоўка, Зялёны Бор і Навасёлкі. Тут студэнты сустрэліся з жанчынамі, якія беражліва, з павагай адносяцца да народных песень. Асабліва многа шчырых і цёплых слоў мы адрасуем Ляхоўскай Г. І., Селяжыцкай Т. І., Ляшчэвіч В. М., Альшук Ф. Ф. і інш. Гэтыя прыветлівыя, простыя і мудрыя жанчыны спявалі нам беларускія і польскія народныя песні. Як многа непаўторных каларытных мелодый мы пачулі і запісалі.

Вось толькі ўслухайцеся ў словы гэтай песні:

На возеры, возеры,
Ды на гібкай кладцы,
Мыла я кашулю
Ды няроднай матцы.
Ой, мыла я, мыла
Ды і перамыла,
Нятродная мамачка
Ды абгаварыла.
Сушыла, сушыла
Ды перасушыла,
Няродная мамачка
Ўсё перасудзіла.

Пазнаёміліся нашы студэнты і з мясцовымі вясельнымі, радзіннымі і каляндарнымі абрадамі і звычаямі. Усім спадабаліся і глыбока запалі ў душу любоўныя, сямейна-бытавыя, гістарычныя і жартоўныя песні. І як не ўсміхнуцца пасля зухаватых прыпевак Е. Н. Данілевіч.

Цераз сад-вінаград
Гнала я каровы.
Забылася папытаць,
Ці мілы здаровы.
Або:
Заліхвацка піў Пахом
За сталом і за вуглом.
Больш Пахом ужо не п´е,
Бо на лякарствах ён жыве.

Пачулі мы цікавыя звесткі аб святкаванні Вялікдзеня, Юр´я, Месухі. Жанчыны прыгадалі нам «гуканне» вясны дзяўчатамі ў вянках з вецця маладой бярозы і чаромхі, выган скаціны на Юр´еў дзень і абкурванне яе купальскімі травамі, ядлоўцам, травой, запаленымі ў гаршку.

Зацікавілі нас гісторыя Ашмянскага раёна і паходжанне тапонімаў і мікратапонімаў. Пабывалі нашы студэнты ў Ашмянскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Не забыліся мы са студэнтамі нізка пакланіцца, аддаць дань памяці магіле народнага паэта-дэмакрата Францішка Багушэвіча, што ў вёсцы Жупраны. А пазней наведалі Кушляны, бацькаўшчыну Мацея Бурачка. Тут усе мы прычасціліся святлом мудрай паэзіі і жыццём вялікага беларускага песняра. Пазнаёміліся з вельмі цікавым, улюблёным у гісторыю і культуру роднага краю чалавека — дырэктарам Кушлянскага музея — Алесем Пятровічам Жамойціным, які правёў змястоўную экскурсію на паэтавай сядзібе, на той зямлі, адкуль у гады беспрасветнай цемры і рэакцыі раздаўся мужны голас заступніцтва за Беларусь, за абяздоленага селяніна.

Сабраныя намі народна-паэтычныя творы паглыбілі веды па вуснай паэзіі, папоўнілі фактычную аснову фалькларыстыкі. На практыцы нашы студэнты набылі вопыт зносін з людзьмі розных узростаў і характараў, сачылі за бытам і псіхалогіяй працоўнага народа, авалодвалі ўменнем весці краязнаўчую работу.

Прыветлівыя, добразычлівыя і гасцінныя людзі жывуць на Ашмяншчыне. Хочацца падзякаваць усім, хто нас ветліва прымаў і пажадаць ім поспехаў, здароўя і шчасця.

**У. КАЯЛА,**
**Дзм. ЛЕБЯДЗЕВІЧ,**
**кіраўнікі фальклорнай экспедыцыі, выкладчыкі кафедры беларускай літаратуры.**



*Здымак на памяць каля помніка народнаму паэту-дэмакрату Францішку Багушэвічу.*



*НА ЗДЫМКУ: Алесь Пятровіч Жамойцін, дырэктар Кушлянскага музея, праводзіць экскурсію на паэтавай сядзібе.*

## Спорт

# На барцоўскім дыване

***Верасень-месяц быў небагаты на спартыўныя падзеі ў нашым універсітэце, але навіны, якія мы атрымалі пасля спаборніцтваў, радуюць і ўражваюць.***

Барцы грэка-рымскага стылю дэманстравалі сілу і майстэрства ў паядынках на Кубак Адрыятыкі ў г. Пула, што ў Харватыі. Чэмпіянат праходзіў у прыгожым горадзе, які з´яўляецца зонай адпачынку, на беразе Адрыятычнага мора. Нашы спартсмены-барцы праязджалі самы доўгі тунель у Еўропе працягласцю 5 тыс. 462 метра. Магчыма, гэта цудоўнае месца яшчэ больш надало ўпэўненасці ў сваіх сілах.

Нашы спартсмены выступілі дастаткова паспяхова, занялі 2 агульнакамандное месца. Віншуем чэмпіёнаў — Аплевіча Эдуарда, Сідарэнка Аляксандра, Бойка Юрыя і спартсменаў, якія ўзняліся на другую ступеньку п´едэстала гонару на гэтым прэстыжным чэмпіянаце — Жука Віталія і Храброва Юрыя. Жадаем ім у далейшым так паспяхова адольваць вяршыні спорту і п´едэстала павагі, радаваць балельшчыкаў поспехамі на барцоўскім дыване.

У верасні ў Стакгольме (Швецыя) адбыўся чэмпіянат свету па грэка-рымскай барацьбе. Прадстаўляў універсітэт студэнт факультэта фізічнага выхавання Валерый Цыленць. У вагавай катэгорыі да 82 кг Валерый заняў ганаровае 4 месца (у гэтай вагавай катэгорыі выступалі 32 удзельнікі ўсіх краін свету). І сустрэчу Валерый выйграў у прадстаўніка Грузіі, майстра спорту міжнароднага класа Дарчыя. Уступіў у нялёгкай барацьбе 5-кратнаму чэмпіёну Савецкага Саюза, 2-кратнаму прызёру Алімпійскіх гульняў Турлыханаву (Казахстан). Пасля чаго ўпэўнена працягваў паядынкі і выйграў у прадстаўніка Польшчы Топара, атрымаў чыстую перамогу над чэмпіёнам маладзёжнага першынства свету шведам Лідбаргам. У фінальнай барацьбе за 3 месца ўступіў толькі адзін бал прызёру чэмпіяната Еўропы, прадстаўніку Расіі Карданаву.

Далучаемся да шматлікіх віншаванняў у адрас Валерыя Цыленца і ўсіх выкладчыкаў кафедры фізічнага выхавання, якія дапамагалі спартсмену ў падрыхтоўцы да спаборніцтваў.

Асобна хочацца сказаць аб арганізацыі чэмпіянату. Спартсменаў прывітаў і назіраў за ходам паядынкаў кароль Швецыі Карл XVI. Вялікую ўвагу чэмпіянату аказвалі тэлебачанне і прэса. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў адбылося ў Блакітнай Зале гарадской ратушы, дзе адбываецца ўручэнне Нобелеўскай прэміі.

У цяперашні час спартсмены універсітэта рыхтуюцца да рэспубліканскай спартакіяды па 16 відах спорту. Гэта патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл ад студэнтаў, выкладчыкаў, трэнераў для падрыхтоўкі да будучых стартаў. Газета будзе і ў далейшым інфармаваць чытачоў і балельшчыкаў аб спартыўных падзеях ва універсітэце.

**Н. ПЯТРОВА.**

## Гумар

# Вясёлы перапынак

### АБ АБІТУРЫЕНТАХ

* * *

— Дайце, калі ласка, тры даведкі: дзе знаходзіцца радыётэхнічны інстытут, калі пачнуцца экзамены і што такое біном Ньютана?

* * *

— Іншыя ў ВНУ ідуць з нейкім навуковым багажом, а я так, з адной толькі запіскай.

* * *

Атрымаўшы двойку на прыёмным экзамене ў тэатральным інстытуце, абітурыент пакрыўджана надзьмуў губы:

— А я думаў, што буду адказваць з суфлёрам.

* * *

Размаўляюць два абітурыенты:

— Кажуць, што розум дае маці, а не інстытут.

— Гэта сапраўды так, я заўважыў, што ты вырас сіратой.

* * *

— Купіце трэніраванага сабаку.

— А хто яе бацькі?

— Прычым тут бацькі? Не ў ВНУ ж ёй паступаць!

### КУДЫ Я ТРАПІЎ

Студэнт медыцынскага інстытута «плавае» на экзамене па хірургіі. Жадаючы яму дапамагчы, прафесар бярэ ў рукі скальпель, прыкладвае яго да грудзей студэнта і пытаецца:

— Куды я траплю?

Студэнт без цені сумнення адказвае:

— Прама ў міліцыю!

### АДЗІНЫ ВЫХАД

У барацьбе са спісваннем у час экзаменаў прафесар Б. Сава прымяняе ўласны метад: залікі і экзамены ён прымае ў неасветленай аўдыторыі.

### СТУДЭНЦКІ БУДЗІЛЬНІК

На факультэце механікі зроблены арыгінальны будзільнік. Першыя дзесяць хвілін ён звініць нармальна, другія дзесяць хвілін імітуе гук працуючага касмічнага рухавіка, а апошнія дзве хвіліны — голас дэкана факультэта.

### НАВУЧАННЕ Ў СНЕ

Яшчэ ўчора аб навучанні ў сне гаварылася як аб якімсьці цудзе. Сёння гэтым нікога не здзівіш: так вучацца цэлымі аўдыторыямі.

### ДОБРАЯ ПАРАДА

Пачынаючы студэнцкае жыццё, памятайце, што ва універсітэце вас прымаюць за дарослага чалавека, лекцыі і семінары вы можаце наведваць, а можаце не наведваць; залікі і экзамены вы можаце здаваць, а можаце і не здаваць. І студэнтам можаце быць, а можаце і не быць.

### ПЕРСПЕКТЫВА РОЗНЫХ ПОГЛЯДАЎ

— Вы дрэнна скончыце,— сказаў прафесар студэнту, які лянуецца.— Нічога, прафесар, мне галоўнае — скончыць,— адказаў студэнт.

### УЗНЯТЫ ЎЗРОВЕНЬ НАВУКІ

Ва універсітэце арганізаваны эксперыментальныя групы, у якіх залікі і экзамены прымаюцца самымі студэнтамі. Эксперымент упаўне апраўдаў сябе,— у залікоўцы толькі «добра» і «выдатна».

**(«Студенческий меридиан»).**


Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы на месяц
Аб´ём газеты — адзін друкаваны аркуш
Зак. 4271
Наклад 2 000 асобнікаў

Газета надрукавана афсетным способам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15.00.
Рэгістрацыйнае пасведчанне 421

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
ВУЧОНАЯ РАДА УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

В. а. рэдактара
У. П. АМЕЛЬКА